У агульных рысах ужо вызначаны **асноўныя функцыі і задачы рэгіянальнага кіравання:**

— каардынацыя выканання мерапрыемстваў і маніторынг дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця краіны і рэгіёна;

— распрацоўка і рэалізацыя стратэгіі і канкрэтных мэтавых праграм інавацыйнага развіцця рэгіёнаў (абласцей, раёнаў, гарадоў, аграгарадкоў, сёл) і канкрэтных прадпрыемстваў і арганізацый усіх форм уласнасці;

— стварэнне і развіццё інавацыйнай дзейнасці мясцовых органаў кіравання, рэгіянальных інавацыйных структур;

— распрацоўка спецыяльных заканадаўчых актаў, якія вызначаюць прававы статус, парадак і ўмовы дзейнасці суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры;

— забеспячэнне фінансавання рэгіянальных праграм інавацыйнага развіцця, арганізацыйна-фінансавая падтрымка малых і сярэдніх прадпрыемстваў розных форм уласнасці;

— забеспячэнне распрацоўкі і кантролю за выкананнем паказчыкаў бізнес-планаў (інавацыйных раздзелаў) рэгіёнаў, арганізацый і прадпрыемстваў розных форм уласнасці;

— ідэалагічнае і інфармацыйнае забеспячэнне інавацыйнага развіцця рэгіёна, фарміраванне інавацыйнай культуры, крэатыўнага мыслення насельніцтва, стварэнне інфармацыйна-ідэалагічных і сацыяльных цэнтраў па забеспячэнні інавацыйнай дзейнасці ў рэгіёне;

— падрыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кадраў для інавацыйнай дзейнасці, мэтавая падрыхтоўка спецыялістаў па інавацыйнаму менеджменту, стварэнне і развіццё сеткі бізнес-інкубатараў і бізнес-школ, цэнтраў навукова-тэхнічнай творчасці моладзі;

— міжрэгіянальнае і міжнароднае навукова-тэхнічнае і інавацыйнае супрацоўніцтва, стварэнне таваправодзячай сеткі ўнутры краіны і за яе межамі;

— стварэнне цэнтраў трансфера тэхналогіі, тэхнапаркаў;

— стварэнне шматфункцыянальных экалагічных сістэм і безадходнай вытворчасці.

Хачу адзначыць, што рэгіянальныя органы кіравання і самакіравання ўжо вызначылі канкрэтныя мэты, задачы і напрамкі інавацыйнага развіцця ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве. У галіне інфармацыйных тэхналогій ідзе стварэнне інавацыйнай інфраструктуры.

Важная роля адводзіцца свабодным эканамічным зонам "Брэст", "Віцебск", "Гомель-Ратон", "Гроднаінвест", "Мінск".

Вызначаны аб'екты інавацыйнага развіцця ў кожнай з абласцей і ў Мінску, зроблены навуковыя разлікі працоўных, інтэлектуальных, эканамічных, матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў.

Больш грунтоўна да аналізу пазначаных вышэй праблем можна будзе вярнуцца пасля прыняцця Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2007—2010 гады.

---

***Каваленя Аляксандр Аляксандравіч** — дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар*

***Карзенка Георгій Уладзіміравіч** — загадчык кафедры паліталогіі і права Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка, доктар гістарычных навук, прафесар*

Пытанні інавацыйнага развіцця даўно ставіліся на павестку дня навукоўцамі і палітыкамі многіх высокаразвітых краін. Сусветная практыка паказвае, што прыярытэтныя пазіцыі займаюць менавіта тыя краіны, якія здольныя змяншаць долю матэрыяльных рэсурсаў у вытворчасці і павялічваць эканамічнасць і энерганасычанасць тэхналагічных працэсаў. Сёння інавацыйная дзейнасць набывае ўсё больш прагматычны характар. Так, ЗША распрацавалі дэтальны прагноз эканамічнага і сацыяльнага развіцця на 100 гадоў, у кантынентальным Кітаі — на 60 гадоў. Пошуку інавацыйных шляхоў развіцця шмат увагі надаецца ў Еўропе, Расіі, Казахстане.

Ухваленая на III Усебеларускім народным сходзе, **Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006—2010 гг.** прадугледжвае стварэнне эканомікі, якая будзе заснавана на навейшых навуковых дасягненнях, з'яўляецца сацыяльна арыентаванай і забяспечыць дастойны жыццёвы ўзровень грамадзян рэспублікі.

Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій зменіць не толькі характар узаемаадносін навукі і вытворчасці, але і адносіны паміж людзьмі. Толькі тыя, хто будуць па-сапраўднаму ўзброены навейшымі ведамі аб грамадскім развіцці, змогуць адэкватна адказваць на выклікі часу і паспяхова ўдзельнічаць у сацыяльна-эканамічных пераўтварэннях.

Інавацыйная дзейнасць для вучоных-гуманітарыяў не з'яўляецца чымсьці прынцыпова новым. Ва ўсе перыяды гісторыі іх даследаванні непасрэдна ўкараняліся ў практыку, фарміравалі светапогляд народа і яго эліты, забяспечвалі неабходны баланс грамадскага развіцця.

Вядома, што **асноўная сутнасць інавацый** — максімальна аператыўнае афармленне вынікаў навуковых даследаванняў у якасці гатовага прадукта для выкарыстання грамадствам у вытворчым працэсе. Спажыўцом гуманітарных ведаў з'яўляецца ўсё грамадства. Таму **мэта інавацый у галіне гістарычных навук** — прыстасаваць інфармацыйныя матэрыялы для патрэб адукацыі і выхавання, а таксама духоўнага, эстэтычнага, этычнага, прававога, палітычнага развіцця людзей. Адзначым, што гістарычная навука ўключае ў сабе некалькі ступеняў абагуль-

нення, сярод якіх вылучаюцца **тры прынцыповыя**: фундаментальныя навуковыя веды, навукова-папулярныя веды (галіна грамадскіх навук), папулярныя веды (адукацыя і прэса).

Дзейнасць Інстытута гісторыі, як і іншых устаноў НАН Беларусі, разгортваецца перш за ўсё ў галіне фундаментальных навуковых распрацовак, калі ствараецца зыходны навуковы прадукт, які служыць асновай для наступных тэматычных распрацовак у міністэрствах адукацыі, культуры, іншых ведамствах, скарыстоўваецца сродкамі масавай інфармацыі. Таму адным з галоўных палажэнняў інавацыйнай палітыкі інстытута з'яўляецца паслядоўнае вылучэнне прыярытэтаў і іх паэтапная рэалізацыя з атрыманнем канкрэтных вынікаў на кожным этапе.

**Укараненне інавацый патрабуе пошуку і развіцця новых кірункаў дзейнасці.** Сёння мы ажыццяўляем некаторыя прынцыпова новыя навуковыя распрацоўкі. Напрыклад, разам з Цэнтрам геафізічнага маніторынгу НАН Беларусі пачынаем збіраць і аналізаваць звесткі пра тэктанічныя праяўленні, што адбыліся на тэрыторыі Беларусі і былі зафіксаваны ў пісьмовых крыніцах. Гэта дазволіць спецыялістам устанавіць заканамернасці тэктанічных рухаў зямной кары, якія мелі месца ў мінулым, і зрабіць навуковыя прагнозы, каб папярэджваць цяжкія наступствы прыродных катастроф.

Уяўляецца перспектыўным і праект па вывучэнні гісторыі Белавежскай пушчы, які мы здзяйсняем з навуковымі супрацоўнікамі Нацыянальнага парка “Белавежская пушча” і польскімі вучонымі. Ажыццяўленне яго ў будучым можа перарасці ў шматгадовую комплексную міжнародную праграму, што дазволіць стварыць абагульняючыя работы, распрацаваць маршруты экалагічнага турызму, пашырыць цікавасць міжнароднай супольнасці да гэтага унікальнага прыроднага аб'екта, які ўнесены ў спіс помнікаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Сёння Інстытут мае каштоўную калекцыю археалагічных матэрыялаў з дзесяткамі тысяч адзінак, якая пачала ствараццa з сярэдзіны 1920-х гг. Мэтава рэарганізаваны архіў археалагічных справаздач, археалагічная бібліятэка, якая створана і эфектыўна функцыяніруе з пачатку 1990-х гг. пад кіраўніцтвам В.У.Мядзведзевай, Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі, які ўвайшоў у склад інстытута з 1987 г.

Для папулярызацыі навуковых даследаванняў у 2006 г. адкрыта старонка на інтэрсайце, вядуцца работы па распрацоўцы шматстаронкавага сайта з мяркуемым далучэннем да іншых інфармацыйных рэсурсаў краіны. Стварэнне інфармацыйнага даведачнага комплексу дакументаў, стандартаў апісання і перадачы даных дазволіць забяспечыць даследчыкаў навейшымі матэрыяламі.

Вядзецца прапаганда гістарычных ведаў праз выданне навуковых часопісаў і зборнікаў. Намаганнямі А.А.Мяцельскага, М.І.Лашанкова, А.М.Мядзведзева, В.С.Вяргей, А.В.Іова з 1993 г. было адноўлена выданне “Гістарычна-археалагічнага зборніка”, заснаванага яшчэ ў 1927 г. З 1999 г. А.М.Мядзведзевым, І.М.Язэпенкам наладжана выданне зборніка “Матэрыялы па археалогіі Беларусі” (заснаваны ў 1957 г.). Плануецца арганізаваць выданне навуковага гістарычнага часопіса “Айчынная гісторыя”. Вялікія надзеі мы ўскладаем на археалагічны музей. Ідэю арганізаваць яго яшчэ ў 1970-х гг. выказаў Л.Д.Побаль. Сёння пры актыўнай падтрымцы Старшыні прэзідыума НАН Беларусі М.У.Мясніковіча мы прыкладаем шмат намаганняў для яго стварэння.

Усё гэта павысіць прафесійную кампетэнтнасць кадраў, іх творчую актыўнасць, дазволіць абапірацца на сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі.

Безумоўна, ажыццявіць інавацыйную дзейнасць **змогуць толькі высокакваліфікаваныя кадры.** Доўгатэрміновай асновай у вырашэнні кадравых праблем з'яўляюцца асноўныя палажэнні **Канцэпцыі дзяржаўнай кадравай палітыкі Рэспублікі Беларусь**, зацверджанай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001 г.), палажэнні праграмы **“Навуковыя кадры”**, якая зацверджана пастановай Савета Міністраў (2002 г.). Перад навуковымі ўстановамі пастаўлена задача прыцягнуць у навуку таленавітую моладзь, стымуляваць яе дзейнасць, павышаць эфектыўнасць падрыхтоўкі кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.

Асноўнай крыніцай фарміравання навуковых кадраў з'яўляецца аспірантура. Па гістарычных спецыяльнасцях яна функцыяніруе ў Інстытуце гісторыі, Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, з 1999 г. — пры Беларускім навукова-даследчым інстытуце дакументазнаўства і архіўнай справы, пры вышэйшых навучальных установах — БДУ, БДПУ імя Максіма Танка, Брэсцкім і Гродзенскім дзяржаўных універсітэтах.

У 1990-х гг. у фарміраванні кадравага корпуса гістарычнай навукі **адсутнічала мэтанакіраваная дзяржаўная палітыка**, а падрыхтоўка вучоных праводзілася без уліку перспектыў развіцця гістарычнай навукі. Дысертацыі пісалі зыходзячы з патрэб кафедраў у спецыялістах адпаведнага профілю, для чытання пэўных лекцыйных курсаў і правядзення семінарскіх заняткаў. Зацверджаныя вучонымі саветамі тэмы доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый не заўсёды адпавядаюць сучасным навуковым тэндэнцыям, не ўлічваюць патрэбы дзяржавы і грамадства ў даследаваннях актуальных навуковых праблем. Недастаткова вядзецца падрыхтоўка кадраў па такіх кірунках, як метадалогія гістарычнай навукі, крыніцазнаўства і гістарыяграфія, сацыяльна-эканамічныя праблемы сучаснага грамадства, геапалітычныя і цывілізацыйныя працэсы, распрацоўка новых мадэлей і канцэпцый гістарычнага развіцця. Сярод даследчыкаў існуе тэндэнцыя вывучаць гісторыю сярэднявякоўя і праблемы XIX ст. Недастаткова аналізуюцца дасягненні і праблемы гісторыі савецкага перыяду. Існуючая спецыялізацыя прыводзіць да таго, што рыхтуецца шмат вузкіх спецыялістаў, якія не могуць зрабіць гістарычных абагульненняў.

Адзначым, што ў першай палове 1990-х гг. знізіўся прыём у аспірантуру па спецыяльнасцях

гістарычнага профілю. З 1996 г. колькасць аспірантаў па гістарычных спецыяльнасцях налічвалася: у 1996 г. — 51 чалавек, 2000 г. — 71, 2005 г. — 70 чалавек. Аднак рост прыёму ў аспірантуру і выпуск з яе толькі ў некаторай ступені ўплываюць на ратацыю кадраў, эфектыўнасць іх падрыхтоўкі і паляпшэнне якаснага складу навукоўцаў.

Якія **прычыны вельмі нізкай эфектыўнасці** дзейнасці аспірантуры былі па спецыяльнасцях гістарычнага профілю? Па-першае, у многіх аспірантаў першага года навучання не былі здадзены кандыдацкія экзамены, адсутнічалі напрацоўкі па тэме дысертацыйнага даследавання і навыкі навукова-даследчай работы. Па-другое, у навуковых і вышэйшых навучальных установах не былі створаны аптымальныя сацыяльныя, матэрыяльна-тэхнічныя, інфармацыйныя ўмовы для плённай працы над дысертацыямі. Як вынік — трохгадовы тэрмін для падрыхтоўкі і абароны кандыдацкай дысертацыі станавіўся ў большасці выпадкаў нерэальным. Па-трэцяе, нізкая матывацыя аспірантаў на абарону дысертацыі ва ўстаноўлены тэрмін, што выклікана перш за ўсё адсутнасцю рэальных перспектыў навуковай кар’еры і матэрыяльных стымулаў для абароны.

Не вызначаецца высокімі паказчыкамі эфектыўнасці і дактарантура. Згодна са статыстычнымі данымі ў тэрмін да года пасля яе заканчэння абаранілі доктарскія дысертацыі па гістарычных спецыяльнасцях толькі 10% саіскальнікаў, да 2 гадоў — 30%, да 3 гадоў — 30%, да 4 гадоў — 10%, да 5 гадоў — 20%. Зацягванне тэрміну абароны доктарскіх дысертацый да 5 гадоў, а кандыдацкіх — да 10 гадоў адмоўна ўплывае не толькі на ўзроставы склад навукова-педагагічных кадраў, але і прыводзіць да таго, што тэма і вынікі даследавання становяцца неактуальнымі.

Вучоныя ступені па гістарычных спецыяльнасцях прысуджалі 6 саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый: у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі (айчынная гісторыя, археалогія, гістарыяграфія, крыніцазнаўства, метады гістарычнага даследавання); Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі (этнаграфія, этналогія, антрапалогія); БДУ, дзе працавалі два саветы (айчынная гісторыя, усеагульная гісторыя, гістарыяграфія, крыніцазнаўства, метады гістарычнага даследавання, гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі); БДПУ імя Максіма Танка (айчынная гісторыя); ГрДУ імя Янкі Купалы (тэорыя і гісторыя культуры).

Эфектыўнасць падрыхтоўкі кадраў у 1991—2005 гг. можна прасачыць па табліцы, якую падрыхтавалі Г.Карзенка і Ю.Зяньковіч.

**Абарона доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па гістарычных навуках у Рэспубліцы Беларусь (1991—2005 гг.)**

| Год | Доктарскія дысертацыі | Кандыдацкія дысертацыі | Усяго |
|---|---|---|---|
| 1991 | 3 | 20 | 23 |
| 1992 | 6 | 15 | 21 |
| 1993 | 5 | 20 | 25 |
| 1994 | 2 | 21 | 23 |
| 1995 | 5 | 19 | 24 |
| 1996 | 5 | 12 | 17 |
| 1997 | 1 | 12 | 13 |
| 1998 | 3 | 10 | 13 |
| 1999 | 5 | 30 | 35 |
| 2000 | 8 | 29 | 37 |
| 2001 | 6 | 30 | 36 |
| 2002 | 8 | 28 | 36 |
| 2003 | 7 | 45 | 52 |
| 2004 | 3 | 29 | 32 |
| 2005 | 3 | 43 | 46 |
| **Усяго** | **70** | **363** | **433** |

У цэлым змяненні ёсць, хоць агульную карціну падрыхтоўкі гістарычных кадраў характарызуюць спады і пад’ёмы. З 1996 па 2000 г. былі абаронены ўсяго 22 доктарскія і 93 кандыдацкія дысертацыі, што сведчыць аб скарачэнні кадраў гісторыкаў вышэйшай кваліфікацыі — як дактароў, так і кандыдатаў навук. І гэта нягледзячы на тое, што ў рэспубліцы ў той час патрабаванні да дысертацыйных даследаванняў былі зніжаны. І толькі ў 2001—2005 гг. сітуацыя пачала змяняцца да лепшага — абаронены 27 доктарскіх і 175 кандыдацкіх дысертацый.

**Асноўныя недахопы дысертацый** па гістарычных навуках зводзяцца да наступнага: прадстаўленыя вынікі маюць нізкую ступень навуковай навізны; палажэнні, якія выносяцца на абарону, недастаткова аргументаваны; вывады па дысертацыях неканкрэтныя, дэкларацыйныя або носяць трывіяльны характар; вынікі дысертацыйнага даследавання мала адлюстраваны ў навуковых артыкулах.

Істотны недахоп многіх дысертацый — слабы аналіз гістарыяграфіі праблемы, у асноўным даецца беглая анатацыя апублікаваных работ. Сустракаюцца і такія факты, калі ігнаруецца расійская і замежная літаратура, а аўтар выстаўляе сябе ў ролі першаадкрывальніка навуковай тэмы. Дысертантамі недакладна фармулююцца мэты і асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, і як вынік — атрымліваюцца слабыя тэарэтычныя абагульненні.

Важнай умовай павышэння эфектыўнасці развіцця любой навукі, у тым ліку гістарычнай, з’яўляюцца распрацоўка і ўкараненне сістэмы сярэднетэрміновага і доўгатэрміновага прагназавання патрэбнасці ў навуковых кадрах вышэйшай кваліфікацыі. Разам з тым органы дзяржаўнага кіравання не маюць абгрунтаваных даных аб перспектыўнай патрэбе гістарычных кадраў адпаведнага профілю.

Актуальнай з’яўляецца і праблема кадравага “амалажэння”. Сярэдні ўзрост саіскальнікаў, якім у 1991—2005 гг. была прысуджана навуковая ступень доктара гістарычных навук, складае 54 гады, кандыдата навук — 33 гады. Больш за трэць даследчыкаў перасягнула 50-гадовы рубеж, уключаючы 80% дак-

тароў і 25% кандыдатаў навук. Асабліва крытычна выглядае ўзроставая структура дактароў навук, сярод якіх доля ўзроставай групы маладзей за 40 гадоў складае менш 0,5%. І наадварот, амаль $^{2}/_{3}$ дактароў маюць узрост 60 гадоў і больш. Большая частка дактароў і больш за 400 кандыдатаў, якія працуюць у вышэйшых навучальных установах, даследчых інстытутах, дзяржаўных структурах, маюць пенсійны ўзрост.

Сёння ў Інстытуце гісторыі працуюць 94 навуковыя супрацоўнікі. Сярод іх 12 дактароў навук і 52 кандыдаты навук. Аднак у інстытуце адчуваюцца кадравыя складанасці, працуе толькі адзін доктар навук дапенсійнага ўзросту, большасць высокакваліфікаваных спецыялістаў маюць узрост больш за 65 гадоў. Апошнім часам мы актывізавалі работу па падборы кадраў у аспірантуру і дактарантуру, дзе навучаюцца 17 чалавек.

**Лічым неабходным** ініцыіраваць пераход да падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі на аснове дзяржаўнага заказу і прыступіць да стварэння рыначнага механізму рэгулявання плана прыёму аспірантаў. Гэта дазволіць пераадолець парадаксальную сітуацыю: рыхтуем шмат, але для каго?

Для павышэння якасці дысертацыйных даследаванняў **важна ўдасканальваць нацыянальную сістэму атэстацыі навукова-педагагічных кадраў**, якая сфарміравалася ў 1990-я гг. ВАК Рэспублікі Беларусь здзяйсняе значную дзяржаўную функцыю па ацэнцы інтэлектуальна-творчага ўзроўню саіскальнікаў навуковых ступеней і навуковых званняў і іх рэальнага ўкладу ў развіццё навукі, вытворчасці, адукацыі і культуры. Сёння дзейнічаюць зацверджаныя ВАКам новыя праграмы па здачы кандыдацкіх экзаменаў і новыя патрабаванні да дысертацый і саіскальнікаў навуковых ступеняў і званняў.

Ад значнасці атрыманых вынікаў у даследаваннях па гісторыі ў многім залежыць агульны ўзровень культуры ўсяго грамадства. Без глыбокага і аб'ектыўнага асэнсавання гістарычнага вопыту мінулага нельга эфектыўна вырашаць сучасныя праблемы, паспяхова рухацца па шляху прагрэсу.

Сёння **неабходна вырашыць наступныя прынцыповыя навуковыя задачы**: прааналізаваць дыялектыку агульнага і адметнага ў старажытнай гісторыі славянскіх народаў; вытокі, этапы фарміравання і развіцця беларускага этнасу; генезісу феадалізму на беларускіх землях, функцыяніравання першых дзяржаўных утварэнняў, станаўлення элементаў беларускай дзяржаўнасці, гісторыі стварэння і развіцця ВКЛ; даследаваць сацыяльна-эканамічную гісторыю Беларусі, становішча саслоўяў і класаў у XVI—XIX стст., фарміраванне і развіццё нацыянальнай інтэлігенцыі, творчую дзейнасць навуковых і навукова-педагагічных кадраў; распрацаваць новыя падыходы ў асэнсаванні ўплыву індустрыяльных цывілізацый на Беларусь, у станаўленні буржуазнага грамадства, спробах мадэрнізацыі краіны ў пачатку XX ст. Неабходна аб'ектыўна вывучыць рэвалюцыйныя падзеі ў Расіі 1905—1907 гг., 1917 г., ідэйную барацьбу па праблемах станаўлення беларускай дзяржаўнасці, спробы пабудовы новага грамадства на прынцыпах "дзяржаўнага сацыялізму"; паглыбіць даследаванне гераічнай барацьбы беларускага народа супраць фашызму, удзелу выхадцаў з Беларусі ў савецкіх воінскіх фарміраваннях і ў тыле, дзейнасць дзяржаўных органаў па аднаўленні народнай гаспадаркі, даследаванні па пошуку новых форм гаспадарання, спроб дэмакратызацыі грамадства пасля XX з'езда КПСС, крытычна прааналізаваць рэформы ў галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі сярэдзіны 1960—1980-х гг.

**Прыярытэтнымі кірункамі гістарычнай навукі** з'яўляюцца: развіццё гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі, дакладнае фармуляванне яе асноўных прынцыпаў — пераход ад мананавуковых да шырокіх рознабаковых абагульненняў; распрацоўка катэгарыяльнага і паняційнага апарату, увядзенне новых гістарычных дакументаў і фактаў, актывізацыя гісторыка-прыкладных і крыніцазнаўчых даследаванняў; распрацоўка новых мадэлей і канцэпцый гістарычнага развіцця ў спалучэнні з дасягненнямі філасофскай, паліталагічнай, сацыялагічнай думкі, а таксама інавацыйных тэхналогій і методык; апрабацыя новых вучэбных дысцыплін, якія адпавядаюць развіццю грамадства, улічваюць яго інфармаванасць, узровень ведаў і інтарэсаў.

У 2006 г. у рамках выканання дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў "Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры" выдадзены 34 манаграфіі, 19 зборнікаў навуковых работ і зборнікаў, 7 раздзелаў у вучэбных дапаможніках, 5 брашур, 9 гістарычных карт, 2 альбомы. Падрыхтавана 320 навуковых артыкулаў (з іх 57 выдадзена за мяжой), 50 навукова-папулярных артыкулаў, 19 раздзелаў у калектыўных працах. У рамках праграмы выконваецца 6 доктарскіх і 45 кандыдацкіх дысертацый. У 2006 г. 8 чалавек абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Ёсць упэўненасць, што мэтанакіраваная і сістэмная праца ўсяго калектыву Інстытута гісторыі будзе запатрабавана беларускім грамадствам.

Людзі гістарычнай навукі

# Пётр Ціханавіч Петрыкаў — таленавіты вучоны і арганізатар гістарычнай навукі



Немагчыма ўявіць жыццё і дзейнасць чалавека без кантэксту таго часу, у якім ён жыў. Жыццёвы шлях Пятра Ціханавіча Петрыкава — члена-карэспандэнта Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара, — які вельмі нечакана 3 ліпеня 2007 г. пайшоў з жыцця, непарыўна звязаны з гісторыяй нашай краіны. Ён з'яўляўся адным з арганізатараў айчыннай гістарычнай навукі, ім распрацаваны актуальныя кірункі беларускай гістарыяграфіі.

Нарадзіўся Пётр Ціханавіч 12 ліпеня 1927 г. у в. Мікалаеўка Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў шматдзетнай сялянскай сям'і. Яго бацька, Ціхан Нікіфаравіч, служыў у гвардзейскім Праабражэнскім палку. Пасля звальнення ажаніўся з маладой мясцовай сялянкай Аляксандрай (Лёксай) Ісакаўнай Бондаравай. У іх нарадзіліся 9 сыноў і 3 дачкі (яшчэ двое памерлі ў малым узросце). Невялікая гаспадарка Ціхана Нікіфаравіча не магла пракарміць вялікую сям'ю, ён спрабаваў нават перасяліцца ў Сярэднюю Азію. "Аграрнае перанасяленне" ў в. Мікалаеўка спыніла Савецкая ўлада: дзеці пайшлі вучыцца, працавалі ў Гомелі, Магілёве, Ленінградзе, Харкаве.

Старэйшы сын, Аляксандр, служыў у Чырвонай Арміі, абараняў у 1941 г. Беларусь і Маскву, удзельнічаў у Берлінскай аперацыі і вайне супраць Японіі, потым працаваў старшынёй калгаса на радзіме. Васіль перад Вялікай Айчыннай вайной жыў у Мінску, у вайну абараняў Смаленск і Маскву, удзельнічаў ва ўзяцці Берліна, пасля вайны стаў кандыдатам педагагічных навук, займаў пасаду намесніка міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. Міхаіл быў ваенкамам, партызанам на Магілёўшчыне, працаваў у сістэме кантрольна-рэвізійнай службы рэспублікі. Аляксей, які служыў зенітчыкам на граніцы пад Беластокам, і Іван, які быў штурманам цяжкай бамбардзіровачнай авіяцыі, загінулі ў баях з ворагам у 1941 г. Сяргей быў цяжка паранены ў баі ва Украіне, пасля вайны вярнуўся дадому, працаваў настаўнікам у роднай вёсцы. У сясцёр, Марыі, Ганны і Марфы, склаўся звычайны лёс.

Лёс раскідаў дружную і працавітую сям'ю Ціхана Нікіфаравіча і Аляксандры Ісакаўны па розных мясцінах. У в. Мікалаеўка засталася магіла бацькі. Маці знайшла апошні прытулак на Чыжоўскіх могілках у Мінску.

У добразычлівай працавітай сям'і рос і выхоўваўся Пётр. Прагна імкнуўся да ведаў. Чатыры класы скончыў у вясковай школе, пяты — у Мінску, шосты — у суседняй вёсцы, хадзіў за тры кіламетры. У час акупацыі, як гаварыў сам Пётр Ціханавіч, "сядзеў дома". У 1944 г. пайшоў у сёмы клас, хадзіў адзін з вёскі ў школу за 5 кіламетраў, але неўзабаве быў прызваны ў Чырвоную Армію. Праслужыў артылерыстам, радыстам амаль што 7 гадоў. Вайсковую службу закончыў у званні старшыны. У час службы вывучаў прадметы за 8-ы клас самастойна, 9-ы клас скончыў у вячэрняй Уруцкай школе, што каля Мінска, пасля дэмабілізацыі экстэрнам здаў экзамены за 10-ы клас і паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І.Леніна.

Ужо ў студэнцкія гады Пётр Ціханавіч выдзяляўся ўменнем сістэматызаваць і аналізаваць гістарычныя факты. Яго дыпломная праца "Исторические взгляды Н.Г.Чернышевского" была прадстаўлена на



*Пётр Ціханавіч з жонкай, Антанінай Захараўнай.*
Фота 1950-х гг.

Усесаюзным конкурсе студэнцкіх работ у Маскве. Найбольшы ўплыў на фарміраванне светапогляду маладога гісторыка аказалі прафесары Л.С.Абецадарскі, Ф.М.Нячай, В.І.Сцяпанаў, дацэнты П.З.Савачкін, М.Б.Фрыдман. Пасля заканчэння ў 1956 г. гістфака БДУ з адзнакай ён з маладой жонкай, Антанінай Захараўнай, таксама выпускніцай гістфака, па размеркаванню паехаў у в. Шацілкі (цяпер г. Светлагорск) Гомельскай вобласці. Працаваў настаўнікам, а потым завучам сярэдняй школы. Сямейнае і прафесійнае жыццё яго ўладкавалася, але навука вабіла да сябе.

У 1958 г. Пётр Ціханавіч паступае ў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР, дзе пачынае распрацоўваць праблемы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва і грамадзянскай вайны ў Беларусі. У канцы 1950-х—пачатку 1960-х гг. выйшлі першыя навуковыя артыкулы даследчыка, у якіх ужо тады выразна праявіліся асаблівасці яго творчага стылю і ідэйныя перакананні. У 1962 г. пад кіраўніцтвам прафесара І.І.Саладкова абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму "Организация и деятельность революционных комитетов Белоруссии". Пры далейшай распрацоўцы тэмы дзяржаўнага будаўніцтва Пётр Ціханавіч звярнуўся да вывучэння дзейнасці Саветаў у пасляваенныя гады. У 1973 г. ён абараняе доктарскую дысертацыю на тэму "Советы депутатов трудяшихся БССР и их роль в создании материально-технической базы коммунизма (1959—1965 гг.)".

Безумоўна, неабходнымі перадумовамі для творчай дзейнасці вучонага з'яўляюцца станаўленне яго як асобы, яго талент, узровень валодання навуковай метадалогіяй. Але не менш важная і яго грамадзянская пазіцыя, і самаадданае служэнне справе, чуйнае прыслухоўванне да запатрабаванняў жыцця. П.Петрыкаў заўсёды ўмела спалучаў прафесійную, навуковую і арганізацыйную работу. З 1961 г. ён працуе малодшым навуковым супрацоўнікам, вучоным сакратаром, намеснікам дырэктара Інстытута гісторыі па навуковай рабоце, а з 1973 г. вызваленым сакратаром парткама АН БССР. У 1975 г. П.Петрыкава прызначаюць на пасаду дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР, на якой працуе па 1988 г. Адначасова займаецца і выкладчыцкай дзейнасцю ў БДУ.

Пад кіраўніцтвам Пятра Ціханавіча Інстытут гісторыі становіцца цэнтрам гістарычных даследаванняў у рэспубліцы. Тут вызначаюцца канцэптуальныя кірункі развіцця беларускай гістарычнай навукі, вядуцца фундаментальныя навукова-даследчыя работы.

Пры актыўным удзеле П.Петрыкава былі падрыхтаваны 5-томная "Гісторыя Беларускай ССР" (Мн., 1972—1975), аднатомная "Гісторыя Беларускай ССР" (Мн., 1975), "История Полоцка" (2-е выд. Мн., 1987), 4-томная "История рабочего класса Белорусской ССР" (Мн., 1984—1987).

У канцы 1970-х—1980-я гг. Інстытут гісторыі разгарнуў шырокамаштабнае супрацоўніцтва з акадэмічнымі інстытутамі Расіі, Літвы, Украіны, Малдовы, Польшчы. Беларускія, літоўскія, польскія, расійскія, украінскія гісторыкі праводзілі сумесныя даследаванні Літоўскай метрыкі, ажыццяўлялася яе выданне.

Дырэктар Інстытута гісторыі П.Петрыкаў выступаў з дакладамі на навуковых форумах у СССР, ЗША, Румыніі, Польшчы, Іспаніі, Германіі. У 1977 г. Пётр Ціханавіч абіраецца членам-карэспандэнтам АН БССР, а годам пазней Вышэйшая атэстацыйная камісія (ВАК) СССР зацвярджае яго ў вучоным званні прафесара.

Плённа працаваў Пётр Ціханавіч у Міжрэспубліканскім каардынацыйным савеце па гістарычных сувязях беларускага, украінскага і малдаўскага народаў, які быў створаны ў 1973 г. Вынікам сумесных даследаванняў сталі кнігі "Исторические корни дружбы и единения украинского и белорусского народов", "Нерушимая дружба украинского и белорус-



*Пётр Ціханавіч з сынам Сяргеем.* Фота 1960-х гг.

ского народов в период социализма" (абедзве Кіеў, 1978). У 1984 г. група аўтараў і рэдактараў гэтых прац, у тым ліку П.Петрыкаў, была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі Украінскай ССР.

Шмат зрабіў таленавіты арганізатар для стварэння ў Інстытуце гісторыі АН БССР атмасферы творчага навуковага пошуку, дэмакратызму, добрапрыстойных адносін паміж супрацоўнікамі. Усе, каму давodзілася працаваць побач з П.Петрыкавым, адзначаюць выключную працавітасць вучонага, імкненне даводзіць пачатую справу да канца, адстойваць свой пункт гледжання, цвёрдасць і паслядоўнасць у вырашэнні прынцыповых пытанняў.

Вялікую ўвагу Пётр Ціханавіч надаваў пашырэнню ўзаемадзеяння акадэмічнай навукі з ВНУ. П.Петрыкаў з 1975 г. узначаліў першы, створаны ВАКам СССР у Беларусі спецыялізаваны савет па абароне дысертацый па гістарычных спецыяльнасцях пры Інстытуце гісторыі (дагэтуль быў аб'яднаны спецсавет пры Аддзяленні грамадскіх навук АН БССР). За 10 гадоў у ім былі абаронены 23 доктарскія і 114 кандыдацкіх дысертацый. Пяць гадоў ён уваходзіў у склад экспертнага савета ВАК СССР па гістарычных спецыяльнасцях.

Шэсць вучняў Пятра Ціханавіча абаранілі доктарскія, а 18 — кандыдацкія дысертацыі і цяпер працуюць у розных гарадах Беларусі.

Дзейнасць Пятра Ціханавіча звязана з многімі кірункамі сучаснай гістарычнай навукі. Вучоны з вялікай эрудыцыяй і ўнутранай культурай, ён узбагаціў беларускую гістарыяграфію грунтоўнымі даследаваннямі, якія атрымалі прызнанне ў нашай краіне і за яе межамі. Ім напісаны манаграфіі "Организация и деятельность постоянных комиссий местных Советов Белоруссии. 1944—1970 гг." (Мн., 1971), "Советы депутатов трудящихся БССР и их роль в создании материально-технической базы коммунизма (1959—1965 гг.)" (Мн., 1972), "Революционные комитеты Белоруссии" (Мн., 1975), "Забота Советской власти о здоровье трудящихся" (Мн., 1976).

Па праву можна сказаць, што з 1970-х гг. пад кіраўніцтвам П.Петрыкава ствараецца новы кірунак у айчыннай гістарыяграфіі — гісторыя беларускай навукі. У гэтым праявілася яшчэ адна рыса Пятра Ціханавіча як вучонага і кіраўніка — пачуццё новага і празорлівасць у ацэнцы перспектыў развіцця гістарычнай навукі Беларусі. Ён першым пачаў даследаваць гісторыю акадэмічнай навукі. У 1973 г. па рашэнню Прэзідыума АН БССР П.Петрыкаў узначаліў групу навукоўцаў, якія даследавалі гісторыю Акадэміі навук Беларусі. Праз сем гадоў група была рэарганізавана ў аддзел гісторыі навукі Інстытута гісторыі. За 12 гадоў дзейнасці аддзела (закрыты ў 1992 г., адноўлены ў 1999 г., цяпер аддзел сацыяльна-эканамічнай гісторыі, навукі і культуры) яго супрацоўнікамі абаронены 7 кандыдацкіх і 2 доктарскія дысертацыі па розных аспектах гісторыі навукі.

Калі знаёмішся з фактамі біяграфіі гэтага незвычайнага чалавека і з успамінамі людзей, якія яго ведалі, здзіўляешся асабліваму дару Пятра Ціханавіча ствараць калектыў аднадумцаў, знаходзіць людзей, апантаных навукай, вучоных, здольных вырашаць складаныя задачы. Пётр Ціханавіч аб'ядноўваў намаганні гісторыкаў, фізікаў, матэматыкаў, біёлагаў, філосафаў для выканання комплекснага даследавання па гісторыі беларускай навукі. Ён быў адным са стваральнікаў музея гісторыі НАН Беларусі і з 1991 па 1996 г. з'яўляўся яго дырэктарам, зрабіў вялікі ўклад у папулярызацыю навукова-тэхнічных дасягненняў беларускіх вучоных, у развіццё навуковай думкі Беларусі.

Як аўтар і навуковы рэдактар, П.Ц.Петрыкаў удзельнічаў у падрыхтоўцы фундаментальных прац "Академия наук Белорусской ССР" (Мн., 1979), "Наука и техника Советской Белоруссии в 1917—1990 гг. Хроника важнейших событий" (Мн., 1991), "Інстытут беларускай культуры" (Мн., 1993), "Национальная академия наук Беларуси (1929—1999)" (Мн., 1998), "Национальная академия наук Беларуси. Персональный состав" (выйшлі ўжо 3 выданні — у 1998, 1999, 2003 гг.), "Наука Беларуси в XX столетии" (Мн., 2001). Ён з'яўляўся кіраўніком-каардынатарам комплекснай праграмы "Гісторыя навукі і культуры Беларусі (дасавецкі перыяд)". Паспяховая яе рэалізацыя завяршылася выданнем першай вялікай комплекснай працы "Очерки истории науки и культуры Беларуси: IX—начало XX в." (Мн., 1996). Сумесна з доктарам гістарычных навук У.М.Міхнюком ён выдаў кнігу "Историческая наука Белорусской ССР, 80-е годы" (Мн., 1987), дзе прааналізаваны найбольш істотныя дасягненні і праблемы айчыннай гістарыяграфіі. За гады творчай дзейнасці вучоны падрыхтаваў больш за 190 навуковых прац, сярод якіх манаграфіі, зборнікі, брашуры, вучэбныя дапаможнікі, артыкулы.

З 1996 па 1999 г. П.Петрыкаў працаваў першым намеснікам галоўнага рэдактара выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", а з 1999 г. і



*У Інстытуце гісторыі АН БССР.*
Злева направа: І.Я.Марчанка, (?), В.І.Дрыц, П.Ц.Петрыкаў, І.А.Ампілаў, В.П.Раманоўскі. Фота 1980-х гг.

да апошняга дня жыцця галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

"Часы мяняюцца, і мы мяняемся разам з імі" — гаварылі ў старажытнасці. Падзеі перабудовы і пасляперабудовачнага перыяду "натхнялі" некаторых беларускіх гісторыкаў на адмаўленне дасягненняў айчыннай гістарычнай навукі як дасавецкага, так і савецкага перыяду, на перафарбоўку мінулага пераважна ў чорныя тоны. Пётр Ціханавіч быў адным з тых, хто імкнуўся супрацьстаяць шматлікім неаргументаваным заявам, надуманым абвінавачванням. Ён перасцерагаў даследчыкаў ад аднабаковага падыходу да разгляду гістарычных падзей і з'яў. У кнізе "Очерки новейшей историографии Беларуси (1990-е—начало 2000-х годов)" (Мн., 2007) увазе чытачоў прапануецца глыбокі роздум П.Петрыкава пра мінулае і сучаснае гістарычнай навукі, разрыў і сувязь часоў, пра "наватарскія падыходы" асобных гісторыкаў. У гістарычнай навуцы, на думку вучонага, неабходна адмовіцца ад разбуральных падыходаў пры асвятленні ўсходнеславянскага адзінства нашых продкаў, ад русафобіі і антысаветызму і выкладаць гісторыю на аснове сяброўства, супрацоўніцтва і адзінства карэнных інтарэсаў беларускага, рускага і ўкраінскага народаў — бліжэйшых суседзяў па адзінству генетычнага паходжання, мовы, веры, культуры і шматвяковага гістарычнага лёсу. Аўтар пры гэтым падкрэсліваў, што не трэба замоўчваць ці скажаць недахопы і цяжкасці нават змрочных старонак у гісторыі Беларусі. Але галоўную ўвагу гісторыкі павінны звяртаць на тое, што нас аб'ядноўвала, а не раз'ядноўвала ў гісторыі з іншымі краінамі. Толькі такая канцэпцыя адбору фактаў з падзей і з'яў мінулага, такі метад іх навуковага тлумачэння забяспечаць далейшы ўклад гісторыкаў Беларусі ў айчынную і сусветную гісторыю.

Пётр Ціханавіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці краіны і Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі — уваходзіў у склад Дзяржаўнай камісіі па падрыхтоўцы падручнікаў у сацыяльна-гуманітарнай сферы, быў навуковым рэдактарам і рэцэнзентам некаторых з іх. Абіраўся дэпутатам Першамайскага раённага Савета г. Мінска. З 1992 г. быў намеснікам старшыні камісіі НАН Беларусі па гісторыі навукі. Пётр Ціханавіч узначальваў савет ветэранаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Быў адзначаны медалём "За победу в Великой Отечественной войне. 1941—1945 гг.", дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, шматлікімі граматамі іншых дзяржаўных і грамадскіх арганізацый.

3 ліпеня Пятра Ціханавіча Петрыкава не стала. Аддаём належнае памяці гэтага выдатнага чалавека і даследчыка. Ад імя супрацоўнікаў інстытута, калег, сяброў выказваем шчырае спачуванне Антаніне Захараўне, дочкам Наталлі Пятроўне і Галіне Пятроўне, яго родным і блізкім.

**Аляксандр Каваленя,**
*доктар гістарычных навук, прафесар, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі,*

**Георгій Карзенка,**
*доктар гістарычных навук, загадчык кафедры паліталогіі і права БДПУ імя Максіма Танка.*



# Грунтоўны даследчык аграрнай гісторыі Беларусі

*(Да 75-годдзя з дня нараджэння Вячаслава Паўлавіча ПАНЮЦІЧА)*



Захапленне навукай, карпатлівую штодзённую працу, цудоўнае веданне крыніц па аграрнай гісторыі XIX ст. адзначаюць усе, хто сутыкаецца з гэтым сціплым, адкрытым і спагадлівым чалавекам. Сёння Вячаслаў Паўлавіч Панюціч — адзін з аўтарытэтных айчынных даследчыкаў гісторыі Беларусі перыяду капіталізму. Вядучы навуковы супрацоўнік, доктар гістарычных навук, В.П.Панюціч з'яўляецца высокапрафесійным спецыялістам, а яго імя шырока вядома навуковай грамадскасці ў нашай краіне і за яе межамі.

Нарадзіўся Вячаслаў Паўлавіч Панюціч 10 красавіка 1932 г. у в. Осаўцы Пружанскага павета Палескага ваяводства, цяпер Бярозаўскі раён Брэсцкай вобласці. Выхадзец з простай сялянскай сям'і, Вячаслаў Паўлавіч дзякуючы сваёй настойлівасці, працавітасці, мэтанакіраванасці прайшоў шлях ад школьнага настаўніка да кандыдата, а потым — доктара навук. Бацька, Павел Міхайлавіч, і маці, Вольга Рыгораўна, працавалі ў сельскай гаспадарцы. Сястра Раіса ў 1942 г. была вывезена на прымусовыя работы ў Аўстрыю (вярнулася на радзіму ў 1945 г.). Жонка, Клара Макараўна, працуе дацэнтам кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Гісторыя была любімым школьным прадметам будучага даследчыка. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1951 г. ён паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які закончыў у 1956 г. Універсітэт стаў для яго добрай школай усебаковай падрыхтоўкі. Як і ўсе студэнты, што прыйшлі ў БДУ ў пасляваенныя гады, Вячаслаў быў шчодра адораны сваімі настаўнікамі-прафесарамі, якія аддавалі студэнтам веды і цеплыню сваіх шчырых сэрцаў. Разам з ім азамі гістарычных ведаў авалодвалі пазней вядомыя вучоныя — акадэмік Расійскай Акадэміі навук В.С.Сцёпін, член-карэспандэнт НАН Беларусі П.Ц.Петрыкаў, прафесар, доктар гістарычных навук У.І.Лемяшонак, дацэнт, кандыдат філасофскіх навук А.Г.Кляцкоў і іншыя. Пасля заканчэння вучобы два гады малады настаўнік працаваў у Рэчыцкай сярэдняй школе Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці і год — інспектарам Камянецкага раённага аддзела народнай адукацыі.

Аднак яшчэ са студэнцкіх гадоў В.Панюціч марыў пра навуковую працу. У 1959 г. ён паступае ў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР. Гэты крок стаў лёсавызначальным у яго жыцці, якое гісторык назаўсёды звязаў з Акадэміяй навук. Пасля заканчэння аспірантуры працуе малодшым, старшым, а затым вядучым навуковым супрацоўнікам інстытута. У 1966 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму "Формирование сельскохозяйственного пролетариата Белоруссии и его положение в эпоху капитализма (1861—1914 гг.)", у якой на багатым статыстычным і фактычным матэрыяле паказаны сацыяльна-эканамічныя перадумовы гэтага працэсу, прыведзена дынаміка колькасных паказчыкаў сельскагаспадарчых рабочых, умовы іх найму, працы, жылля, побыт.

Пасля шматгадовай напружанай працы ў 1990 г. Вячаслаў Паўлавіч абараніў доктарскую дысертацыю

па сваёй кнізе “Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861—1900 гг.” (Мн., 1990). Ён даказаў, што рэформа 1861 г. у Расійскай імперыі была “чысткай зямель” у інтарэсах капіталізму, праведзенай шляхам масавага насілля над сялянствам. У Беларусі гэты працэс праяўляўся ў захаванні за памешчыкамі значнай часткі адрэзкаў і прысваенні лепшых сялянскіх зямель пры адмежаванні і размеркаванні ўгоддзяў. Другім праяўленнем экспрапрыяцыі сялянства ў ходзе ажыццяўлення рэформы з’яўлялася выкупная аперацыя. Нягледзячы на зніжэнне выкупных плацяжоў у ходзе правядзення рэформы 1861 г. у Беларускім рэгіёне, пераход сялян на выкуп пры незабяспечанасці зямлёй і ўзмацненні агульнага падатковага ўціску паскорыў пралетарызацыю і паўперызацыю асноўнай іх масы, прывёў да паступлення буйных выкупных сум у рукі памешчыкаў і дзяржавы. Аналагічны працэс праходзіў і пасля аграрных рэформ 1863 і 1867 гг. на ўдзельных і дзяржаўных землях. Разам з тым у выніку рэформ казённыя і ўдзельныя сяляне былі забяспечаны надзельнай зямлёй лепш, чым панскія, а выкупныя плацяжы ўносілі ў меншых памерах, што садзейнічала больш хуткаму развіццю капіталістычных адносін у былой дзяржаўнай і ўдзельнай вёсцы.

На аснове аналізу заканадаўчых актаў і статыстычных даных даследчык прыходзіць да важнай высновы, што ў заходніх губернях, у адрозненне ад унутраных і некаторых іншых рэгіёнаў Еўрапейскай Расіі, адмена часоваабавязанага стану сялян, перавод з аброку на выкуп абсалютнай большасці панскіх, а затым і дзяржаўных сялян былі праведзены ўжо ў 1860-я гг. Гэта азначала ліквідацыю феадальнай рэнты — адпрацовачнай (паншчына) і грашовай (аброк), г. зн. аджыўшых прыгонніцкіх вытворчых адносін. Такім чынам ствараліся больш спрыяльныя ўмовы для развіцця капіталізму ў сялянскай гаспадарцы. У Беларусі, як і ў суседняй Літве, найбольш істотныя папраўкі, унесеныя ўказамі ад 1 сакавіка і 2 лістапада 1863 г. ва ўмовы вызвалення панскіх сялян, зводзіліся да скасавання абавязковых пазямельных адносін і значнага зніжэння аброчных і адпаведна выкупных плацяжоў. Аднак і пасля гэтага яны перавышалі вартасць сялянскіх надзелаў. Да 1907 г. былыя панскія сяляне 5 заходніх губерняў унеслі (без дадатковых узносаў па добраахвотным выкупе) 169,3 млн руб. выкупных плацяжоў, што ў 2,3 раза перавышала першапачатковую выкупную пазыку, дадзеную ім дзяржавай. Акрамя таго, да названага часу былыя казённыя сяляне адзначанага рэгіёна заплацілі выкупу 43 млн руб.

На аснове глыбокага вывучэння архіўных матэрыялаў В.Панюціч даказаў, што ў выніку рэалізацыі рэформы 1861 г. памешчыкі вярнулі беларускім сялянам далёка не ўсе землі, адрэзаныя з часоў увядзення абавязковых інвентароў (1840-я—1850-я гг.). Толькі паўстанне 1863—1864 гг., шырокая барацьба сялянства за зямлю не дазволілі памешчыкам правесці новую масавую экспрапрыяцыю сялянскіх надзельных зямель. Пасля рэформы дзяржаўнай вёскі Беларусі вялікія зямельныя масівы засталіся таксама ва ўласнасці дзяржавы.

В.Панюціч комплексна і ўсебакова асвятляе сацыяльна-эканамічную гісторыю сялянства Беларусі другой паловы XIX ст.: сялянскае насельніцтва, абшчына, землеўладанне і землекарыстанне, сельскагаспадарчая тэхніка і сістэмы земляробства, паляводства і жывёлагадоўля, дыферэнцыяцыя сялянства на сялянскую буржуазію (галоўным чынам кулацтва) і сельскі пралетарыят, пераважна з надзелам.

Акрамя адзначанай манаграфіі В.Панюцічам напісаны кнігі “Из истории формирования пролета-





*Сустрэча выпускнікоў 1956 г. гістфака БДУ.* Першы рад: Г.Кароль, А.Кахновіч, П.Петрыкаў, Т.Красоўская, І.Лебедзева, В.Панюціч. Другі рад: А.Барадаўка, А.Кляцкоў, В.Сцёпін, Ф.Барысевіч, М.Галенчык, М.Баранаў, Р.Малюковіч, У.Лемяшонак. 1971 г.

риата Белоруссии, 1861—1914 гг." (Мн., 1969), "Наёмный труд в сельском хозяйстве Беларуси 1861—1914 гг." (Мн., 1996). У іх упершыню спецыяльна даследуюцца сялянскія адыходныя промыслы, выкарыстанне наёмнай працы ў панскіх і кулацкіх гаспадарках Беларусі капіталістычнай эпохі. Унікальнай з'яўляецца манаграфія "Историография аграрной истории Беларуси (1861—1917 гг.)" (Мн., 2005). У кнізе прааналізаваны калектыўныя працы, манаграфіі, шматлікія навуковыя артыкулы за 1910—1990-я гг., разгледжаны дасягненні і недахопы беларускай гісторыка-эканамічнай літаратуры ў асвятленні аграрнай праблематыкі 60—90-х гг. XIX—пачатку XX ст. Усе палажэнні і статыстычныя выкладкі абгрунтаваны дакументамі.

В.Панюціч — сааўтар грунтоўных калектыўных прац па гісторыі Беларусі: "Экономическая история БССР" (Мн., 1969), "Гісторыя Беларускай ССР" (т. 2. Мн., 1972), "История рабочего класса Белорусской ССР" (т. 1. Мн., 1984), "Гісторыя Беларусі" (т. 4. Мн., 2005). Пад рэдакцыяй Вячаслава Паўлавіча і пры яго непасрэдным удзеле (напісана 14 раздзелаў) апублікавана фундаментальная навуковая праца "Гісторыя сялянства Беларусі. Т. 2. Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г." (Мн., 2002), дзе глыбока асвятляюцца важныя аспекты сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця беларускай парэформеннай вёскі. Аўтар справядліва лічыць, што асноўныя палажэнні навукоўца-даследчыка заўсёды павінны быць абгрунтаванымі.

Таленавіты даследчык выступае з шэрагам навуковых артыкулаў у "Весцях Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук" і "Беларускім гістарычным часопісе", у якіх аналізуюцца маладаследаваныя пытанні аграрнай гісторыі другой паловы XIX—пачатку XX ст. Шэраг артыкулаў і нататак В.Панюціча змешчаны ў 6-томнай "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (1993—2003) і 18-томнай "Беларускай Энцыклапедыі" (1996—2004). Яго працы надрукаваны і ў гістарычных часопісах Польскай Рэспублікі. Усяго В.Панюцічам апублікавана больш за 200 навуковых прац. Ён актыўна ўдзельнічаў у рабоце Усесаюзнага сімпозіума па аграрнай гісторыі Усходняй Еўропы (1958—1980 гады), іншых міжнародных канферэнцыях, дзе выступаў з грунтоўнымі навуковымі дакладамі.

Вячаслаў Паўлавіч перадае свой вопыт маладым навукоўцам. Уваходзіў у склад Савета по абароне дысертацый пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, неаднаразова з'яўляўся экспертам і апанентам па доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыях.

Працоўная і творчая дзейнасць В.Панюціча адзначана медалём "Ветэран працы", Ганаровымі граматамі дырэкцыі Інстытута гісторыі, Прэзідыума НАН Беларусі.

Здароўя Вам, дабрабыту, новых творчых поспехаў, шаноўны Вячаслаў Паўлавіч!

**Пётр Петрыкаў,**
*член-карэспандэнт НАН Беларусі,*
**Георгій Карзенка,**
*доктар гістарычных навук, загадчык аддзела сацыяльна-эканамічнай гісторыі, навукі і культуры Інстытута гісторыі НАН Беларусі.*

# ВЯДОМЫ ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ І ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ

*(Да 100-годдзя з дня нараджэння Ніны Васільеўны Каменскай)*

901(092)

28 снежня 2013 г. споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння вядомага беларускага вучонага, члена-карэспандэнта АН БССР Ніны Васільеўны Каменскай.

Нарадзілася яна ў г. Асіповічы Мінскай губерні ў сям'і рабочага-чыгуначніка. Пасля заканчэння сямігадовай школы ў 1929 г. паступіла ў педагагічны тэхнікум у г. Рагачоў. Скончыўшы яго, пачала працаваць настаўніцай няпоўнай сярэдняй школы ў в. Карытнае Асіповіцкага раёна.

У 1933 г. Ніна Васільеўна паступіла на гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута, пасля заканчэння якога ў 1937 г. стала настаўніцай гісторыі ў сярэдняй школе № 1 г. Магілёва. У 1938 г. яна была накіравана ў г. Бабруйск, дзе пачала працаваць інструктарам гарадскога аддзела народнай адукацыі і выкладчыцай гісторыі ў сярэдняй школе № 4. Але дасягнутыя поспехі не поўнасцю задавальнялі Ніну Васільеўну, і ў кастрычніку 1939 г. яна паступіла ў аспірантуру Інстытута гісторыі Акадэміі навук СССР. У жніўні 1941 г. у сувязі з эвакуацыяй інстытута з Масквы Ніна Васільеўна выехала ў Разанскую вобласць. Там яна ў маі 1942 г. уступіла ў рады ВКП(б), працавала загадчыцай парткабінета раённага камітэта ВКП(б).

У сакавіку 1943 г. Н.В.Каменская была выклікана ў Маскву для працягу даследаванняў. У верасні 1944 г. яна закончыла аспірантуру і паступіла на працу ў Інстытут гісторыі Акадэміі навук БССР, дзе была залічана на пасаду старшага навуковага супрацоўніка. Тады ж у складзе калектыва супрацоўнікаў Інстытута гісторыі АН БССР Ніна Васільеўна пераехала з Масквы ў Мінск.

У 1945 г. Н.В.Каменская паспяхова абараніла кандыдацкую дысертацыю па тэме "Образование Белорусской Советской Социалистической Республики", а ўжо ў маі 1946 г. была прызначана на пасаду намесніка дырэктара Інстытута гісторыі АН БССР. Праз два гады, у 1948 г., яна перайшла на працу ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, дзе была зацверджана на пасадзе загадчыка кафедры гісторыі БССР. Аднак сувязяў з Акадэміяй навук Ніна Васільеўна не парывала, заставалася працаваць на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка па сумяшчальніцтве.



У жніўні 1950 г. у сувязі з аб'яднаннем кафедраў гісторыі БССР і гісторыі народаў СССР Ніна Васільеўна вярнулася ў Інстытут гісторыі АН БССР, дзе заняла пасаду загадчыка сектара гісторыі Савецкай Беларусі. У кастрычніку 1954 г. на аснове рашэння Прэзідыума АН СССР яна была накіравана ў дактарантуру Інстытута гісторыі АН СССР. На працягу некалькіх гадоў яна падрыхтавала і ў 1958 г. паспяхова абараніла доктарскую дысертацыю па тэме "Участие белорусского народа в разгроме интервентов и белогвардейцев и социалистическое строительство в Белоруссии в годы гражданской войны (1917—1920)".

Пасля вяртання ў верасні 1956 г. з Масквы працягвала загадваць сектарам гісторыі Савецкай Бе-